# Часопісы, што выходзілі ў міжваенныя гады, сталі даступныя анлайн

14.07.2020 00:47 | Аўтар: Алена Дзядзюля | Медыя, Культура

**Больш за чатыры тысячы нумароў часопісаў, што выходзілі ў міжваенныя гады, сталі даступныя анлайн. Нацыянальная бібліятэка Беларусі запрашае пазнаёміцца з імі на сваім рэсурсе.**




Сёння ў электроннай калекцыі «Беларуская літаратурная спадчына. Часопісы 1919—1939 гадоў» змешчана 270 найменняў перыядычных выданняў, што выходзілі на тэрыторыі БССР і Заходняй Беларусі. Сярод іх — «Нёман», «Маладняк», «Узвышша», «Наш край», «Мастацтва і рэвалюцыя», «Працаўнік асветы», «Штэрн», «Рунь», «Полымя», «Заходняя Беларусь», «Беларускі летапіс», Znicz, выданні для дзяцей, моладзі і жанчын.




Калі пагартаць адсканіраваныя старонкі, можна адчуць, чым жылі нашы папярэднікі, якія тэмы хвалявалі маладых літаратараў, вакол якіх выданняў яны гуртаваліся. Вы даведаецеся, як развівалася прамысловасць, якімі прыладамі і тэхнікай карысталіся сяляне, наколькі шырокі быў краязнаўчы рух, калі па вуліцах Мінска пабеглі першыя трамваі, як выглядаў Дом урада і як будаваўся студэнцкі гарадок БДУ, якія святы і як адзначалі, з якімі цацкамі гулялі малыя ў дзіцячых садках, як жанчыны змагаліся за свае правы, чым швейная фабрыка «Кастрычнік» уражвала замежную дэлегацыю, як працавалі ліКпункты, што адказвалі за ліквідацыю непісьменнасці, якую касметыку і іншыя тавары можна было набыць, якое ў тыя часы было надвор'е і многае іншае.

> Вялікая ўвага ўдзялялася ў тагачаснай прэсе дзецям і моладзі. Абмяркоўваліся школьныя праграмы, настаўнікі дзяліліся сваімі напрацоўкамі і прапановамі, узнімалі пытанні аб тым, якой павінна быць вучэбная праграма, не забываліся не толькі на палітычнае, але і на палавое выхаванне падлеткаў. Дзяцей прывучалі да сацыяльна адказнай працы, дзейнічала многа гурткоў. Дарослыя нават хваляваліся, ці не перагружаны малыя рознымі карыснымі заняткамі.

У той час актыўна развіваўся стаханаўскі рух, але з публікацый вынікае, што ўдарна людзі працавалі не толькі за ідэю: у 1930-я гады найлепшыя работнікі атрымлівалі грашовыя прэміі і рэчавыя ўзнагароды (гэта магло быць паліто, мэбля, швейная машынка). Былі свае стымулы і ў школьнікаў — напрыклад, мне сустрэўся здымак, на якім піянерку за выдатную вучобу каталі на самалёце.




Электронная калекцыя часопісаў вартая ўвагі ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй, культурай, эканомікай, медыцынай, а таксама карысная супрацоўнікам архіваў і музеяў, краязнаўцам, настаўнікам.

Для зручнасці карыстальнікаў выданні падаюцца па прадметных рубрыках: «Адукацыя і выхаванне», «Ахова здароўя і медыцынскія навукі», «Краязнаўства», «Палітыка і грамадства», «Эканоміка», «Статыстыка» , «Сельская гаспадарка», «Мастацтва» і іншыя. Часопісы, прысвечаныя літаратуры і літаратуразнаўству, знаходзяцца ў розных раздзелах у залежнасці ад таго, дзе яны выдаваліся: на тэрыторыі Заходняй Беларусі, у БССР ці за мяжой.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**

**Загаловак у газеце: «Нацыяналка» прапануе...**